Т. С. Бабровіч, С. К. Берднік (Мінск, Беларусь)

## СТРУКТУРА СЛОВАЎТВАРАЛЬНАГА ГНЯЗДА ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ МОЎНАЙ АСОБЫ *(НА ПРЫКЛАДЗЕ ГНЯЗДА З ВЯРШЫНЯЙ РУБІЦЬ)*

Традыцыйна словаўтваральная сістэма беларускай мовы разглядаецца толькі як сукупнасць словаўтваральных фармантаў і словаўтваральных тыпаў. У апошні час характарыстыку асобных словаўтваральных тыпаў прынята суадносіць з пабудовай пэўных класіфікацыйных схем.

Пры гэтым сістэма словаўтварэння выступае як сукупнасць словаўтваральных тыпаў і словаўтваральных гнёздаў. У задачу словаўтваральнага аналізу ўваходзіць не толькі вызначэнне словаўтваральнага тыпу і спосабу асобнага слова, але і выяўленне словаўтваральнай сувязі яго з аднакарэннымі словамі, са словамі адпаведнага тыпу (мадэлі), г. зн. сістэмны падыход.

У вызначэнні словаўтваральных гнёздаў у лінгвістычнай літаратуры сустракаем розныя меркаванні. Мэтазгодна спыніцца на азначэнні, выпрацаваным А. М. Ціханавым: "Пад словаўтваральным гняздом разумеецца ўпарадкаваная адносінамі матывацыі сукупнасць слоў, якая характарызуецца агульнасцю кораня" [1, 36]. А вяршыняй гнязда будзем лічыць "словы (альбо слова) з самай простай словаўтваральнай структурай, г. зн. якія адпавядаюць найменшай колькасці дэрывацыйных крокаў" [2, 51].

Разгледзім словаўтваральнае гняздо з вяршыняй **рубіць**.

У сучаснай беларускай мове ёсць два дзеясловы **рубіць**: 1.'будаваць што-н. з дрэва, бярвення'; 2. 'здабываць (руду, вугаль)' (ТСБМ).

У разгледжаным словаўтваральным гняздзе дзеяслоў **рубіць** рэалізуе значэнне ' будаваць што-н. з дрэва, бярвення'(ТСБМ).




Структуру словаўтваральнага гнязда з вяршыняй **рубіць**, абапіраючыся на працы Я. Л. Гінзбурга [3], А. А. Лукашанца [4], І. У. Каліцені [5], можна падаць схематычна, выкарыстоўваючы аналагічныя сімвалы:

1. **V**-дзеяслоў, **N**-назоўнік, **A**-прыметнік, **D**-дзеепрыметнік;
2. **1**, **2**, **3**, **4** – ступені дэрывацыі.

Словаўтваральнае гняздо з вяршыняй **рубіць** паказана на схеме і складаецца з трох ступеняў дэрывацыі. Ступені дэрывацыі вызначаюцца паводле афіксальных марфем.

На першай ступені дэрывацыі словаўтваральнага гнязда зафіксаваны дзеясловы, дзеепрыметнік, назоўнік.

Дзеясловы **абрубіць, вырубіць, дарубіць, зарубіць, зрубіць, нарубіць, падрубіць, парубіць, прырубіць, урубіць** утвораны прэфіксальным спосабам. Прэфіксы надаюць наступныя значэнні дзеясловам:

**аб-** – 'накіраванасць дзеяння вакол або па краях прадмета' – **аб-рубіць**;

**вы-** – ' завяршэнне дзеяння' – **вы-рубіць**;

**да-** – 'давядзенне дзеяння да поўнага завяршэння, канца, дасягненне мэты, мяжы якога-небудзь дзеяння' – **да-рубіць**;

**за-** – 'закончанасць, вынік дзеяння' – **за-рубіць**;

**з-** – 'закончанасць дзеяння' – **з-рубіць**;

**на-** – 'пашырэнне дзеяння на вялікую колькасць прадметаў' – **на-рубіць**;

**пад-** – 'дадатковае дзеянне для дасягнення лепшага выніку' – **пад-рубіць**;

**па-** – 'закончанасць дзеяння' – **па-рубіць**;

**пры-** – 'злучэнне, змацаванне чаго-н.' – **пры-рубіць**

**у-** – 'накіраванасць дзеяння ўнутр прадмета або асяроддзя' – **у-рубіць** (ТСБМ).

Дзеепрыметнік **рублены** і назоўнік **рубка** ўтвораны суфіксальным спосабам і суадносныя са значэннем дзеяслова.

На другой ступені дэрывацыі зафіксаваны дзеясловы, дзеепрыметнікі, назоўнікі. Гэта дзеясловы незакончанага трывання **абрублівацъ, вырубаць, дарублівацъ, зарублівацъ, падрублівацъ, прырублівацъ**, а таксама зваротны дзеяслоў закончанага трывання **падрубіцца**.

Дзеепрыметнікі **абрублены, вырублены, дарублены, зрублены, нарублены, падрублены, прырублены, урублены** ўтвораны суфіксальным спосабам, іх значэнні суадносяцца з адпаведнымі дзеясловамі.

Назоўнікі ўтварыліся суфіксальным спосабам і маюць розныя значэнні.

**Абрубак** 'адсечаная частка чаго-н. (дрэва, палена і пад.)', 'тое, ад чаго адсечана' (ТСБМ); 'невялікі ўчастак сенажаці' (СПЗБ).

**Абрубка** 'дзеянне паводле дзеяслова абрубіць (адсякаючы частку чаго-небудзь падкарочваючы, падраўноўваючы)' (ТСБМ).

**Выруб** 'месца з рэшткамі высечанага лесу' (ТСБМ); 'зруб' (МДС).

**Вырубка** ' 1. дзеянне паводле дзеясл. вырубіць; 2. месца, дзе высеклі лес; выруб, высечка (ТСБМ); 'выемка ў канцы бервяна, у якую кладзецца другое бервяно ў вугле' (Янк. II).

**Зарубіна** 'разм. засечка, зарубка' (ТСБМ); 'зарубка, засечка' (ТС).

**Зарубка** '1. дзеянне паводле знач. дзеясл. зарубіць; 2. метка, знак, зробленыя сякерай, нажом і пад., засечка' (ТСБМ); 'зарубка, засечка' (ТС).

**Зруб** 'сцены драўлянага збудавання, складзеныя з бярвення або брус-коў, злучаных у чатырохвугольныя вянкі' (ТСБМ); 'сруб' (Касп.); 'сруб хаты' (Шатэр.); 'зруб' (Юрч.).

**Падруба** 'ніжняе бервяно ў зрубе' (ТСБМ); 'першы вянец у зрубе хаты' (ТС); 'нижние брёвна в постройке'(Касп.); 'ніжняя перакладзіна ў праёме дзвярэй, прызба ў старых хатах' (СцрБ).

**Паруб** 'тое, што і парубка' (ТСБМ).

**Парубень** 'абл. жэрдка для прыціскання сена, саломы або снапоў на возе' (ТСБМ); 'жэрдка для прыціскання сена і саломы' (СПЗБ).

**Парубка** '1. дзеянне паводле знач. дзеясл. парубіць; 2. месца, дзе высечаны або высякаецца лес; вырубка; 3. незаконная, недазволеная высечка лесу' (ТСБМ).

**Парубшчык** 'той, хто займаецца парубкай, высечкай лесу'(ТСБМ). **Прырубка** 'дзеянне паводле знач. дзеясл. прырубіць' (ТСБМ).



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Урубак** 'кавалак дрэва ці металу, які ўкладваецца ў выемчаную адтуліну' (ТСБМ).

На трэцяй ступені дэрывацыі адзначаны дзеясловы, назоўнікі, дзеепрыметнікі і прыметнік.

На дадзенай ступені дэрывацыі зафіксаваны зваротныя дзеясловы незакончанага трывання: дарублівацца, **зарублівацца**, **падрублівацца**, **прырублівацца**, **урублівацца**.

Назоўнікі **дарубліванне**, **падрубліванне**, **урубліванне** утвораны суфіксальным спосабам і абазначаюць дзеянне паводле дзеясловаў, ад якіх утварыліся.

Назоўнік **абрубшчыца** ўтвораны спосабам дэрывацыі ад назоўніка **абрубшчык**, суфікс **-шчыц-** указвае на асобу жаночага полу.

Дзеепрыметнікі **неабрублены**, **нявырублены**, **недарублены** ўтвораны прэфіксальным спосабам, прэфікс **не-** надае значэнне адмоўя.

Прыметнік **зрубавы** ўтвораны суфіксальным спосабам.

Такім чынам, словаўтваральнае гняздо з вяршыняй **рубіць** мае тры ступені дэрывацыі, кожная з якіх вылучаецца сваімі асаблівасцямі.

Разгледзім сэнсавыя адносіны паміж словамі ў дадзеным словаўтваральным гняздзе.

Сінанімічныя лексемы **выруб**, **вырубка**; **зарубіна**, **зарубка**; **паруб**, **парубка**.

Антонімамі з'яўляюцца дзеепрыметнікі: **абрублены** – **неабрублены**, **вырублены** – **нявырублены**, **дарублены** – **недарублены**, **зрублены** –**нязрублены**, **падрублены** – **непадрублены**, **прырублены** – **непрырублены**.

Мнагазначныя словы **рубіць**, **вырубка**, **зарубка**, **парубка**.

Упарадкаванасць адкарэнных лексічных адзінак у сучаснай беларускай мове найлепшым чынам адлюстроўвае словаўтваральнае гняздо, якое дае магчымасць не толькі вывучыць розныя аспекты словаўтварэння, але і адлюстраваць асаблівасці сістэмнай арганізацыі лексічнага складу мовы з пункту гледжання сэнсавых узаемасувязей.

Сістэмнае даследаванне словаўтваральных гнёздаў дазваляе зразумець словаўтваральны механізм мовы ў дзеянні, узбагачае лексічны запас моўнай асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Літаратура**


1. Тихонов, А. Н. Основные понятия русского словообразования / А. Н. Тихонов // Словообразовательный словарь русского языка: в 2 т. – М.: Русский язык, 1985. – Т. 1.– С. 18–52.
2. Соболева, П. А. Словообразовательная полисемия и омонимия / П. А. Соболева.– М.: Наука, 1980.–238 с.
3. Гинзбург, Е. Л. Исследование структуры словообразовательных гнёзд / Е. Л. Гинзбург // Проблемы структурной лингвистики. – М., 1973.– С. 146–235.
4. Лукашанец, А. А. Некоторые аспекты изучения словообразовательных гнёзд в русском и белорусском языках / А. А. Лукашанец // АПРС: тез. 5 респ. научн.-теоритич. конф. – Самарканд, 1987. – Ч. 1. – С. 113–116.
5. Каліценя, І.У. Словаўтваральныя гнёзды прыметнікаў у беларускай мове: дыс…канд.філалаг.навук:10.02.01. / І.У. Каліценя. – Мінск, 1998. – 227 с.


**Скарачэнні**


**Касп.** Каспяровіч М. І. Віцебскі краявы слоўнік, А-Я: Матэрыялы / пад рэд. М. Я. Байкова, Б. І.Эпімаха-Шыпілы; Ін-т беларус. культуры. – Віцебск, 1927. – 371 с.

**СирБ** Слоўнік гаворак цэнтральных раёнаў Беларусі: у 2 т. – Мінск, 1990.

**СПЗБ** Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагрнічча: у 5 т.

**ТС** Тураўскі слоўнік: у 5 т. / АН БССР Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа; рэд.А. А. Крывіцкі.–Мінск: Навука і тэхніка, 1982–1985.

**ТСБМ** Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. / АН БССР Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1977–1984.

**Шат.** Шатэрнік Н. Краёвы слоўнік Чэрвеншчыны. – Мінск, 1929.

**Юрч.** Юрчанка Г. Дыялектны слоўнік. З гаворак Мсціслаўшчыны. – Мінск, 1966. – 268 с.

**Янк.II** Янкоўскі Ф. Дыялектны слоўнік II. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1960. – 234 с.